№5 Люты 2007

Свабодны Салігорск

незалежная газэта Салігорска

Выдаецца з верасьня 2006 г. пры інфармацыйнай падтрымцы Маладога Фронта і сайта САЛІГОРСК.org (www.saligorsk.org)

АДЛІГА? НЕ, РЭПРЭСІІ!

За перыяд 14-16 лютага ў Салігорску адбылося 18 затрыманьняў прадстаўнікоў дэмакратычных сілаў Беларусі. Агулам было затрымана 16 чалавек (некаторых затрымлівалі двойчы).14 лютага, у дзень акцыі Любові, праводзіліся правакацыйныя дзеяньні з боку супрацоўнікаў міліцыі з мэтай затрыманьня як мага большай колькасьці моладзевых актывістаў і не дапушчэньня іх да ўдзелу ў цалкам міралюбівам сьвяткаваньні Валянцінавага дня. Так, напрыклад, міліцыянты ў гэты дзень ціснулі на моладзевых актывістаў у школах (трэба адзначыць асаблівую нахабнасьць й жорсткасьць супрацоўніка салігорскае міліцыі Драбудзькі), патрулявалі і наведвалі прыватныя кватэры найбольш актыўных маладзёнаў гораду, рабілі папярэджвальныя тэлефанаваньні бацькам.Непасрэдна напярэдадні акціі а 16-й гадзіне ля цэнтральнага рынку без а ні якіх на тое прычын міліцыянты распачалі хапун і затрымалі 5 моладзевых актывістаў салігоршчыны (Іван Шыла, Павал Філіпеня, Хрысьціна Самойлава - непаўнагадовыя, Віталь Амяльковіч, Павал Батуеў), астатніх удзельнікаў наўпрост такі разагналі. Праз 3 гадзіны ўсіх затрыманых, акрамя Паўла Батуева адпусьцілі. На Паўла Батуева быў складзены пратакол аб адміністратыўным правапарушэньні, а ён сам зьмешчаны ў ізалятар часовага стрыманьня да суду. **Старонка 2**

Память будет увековечена

В 2007 году еврейская община Белоруси планирует установить около 20 памятников на местах уничтожения евреев в годы Второй мировой войны.

Старонка 3

КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ

"Толькі тады, народзе, зажывеш шчасьліва..."

Старонка 2

Цэны на жыльлё зноў імкліва растуць

Цэны на жыльлё ў Беларусі імкліва растуць. Асабліва адчувальна гэта ў Менску, дзе квадратны мэтар аднапакаёвай кватэры каштуе каля 1400 даляраў. **Старонка 3**

У Беларусі даражэюць паслугі мабільнай сувязі

Сёньня ў шэрагу рэгіёнаў Беларусі павялічваюцца стаўкі мясцовых падаткаў на паслугі сувязі і продаж мабільных тэлефонаў. Зьмены адбудуцца ў Менску, а таксама Гомельскай і Магілёўскай абласьцях. **Старонка 4**

Бюро кантактнай работы з наркаманамі адкрыюць у Салігорску

Міжнародная дабрачынная грамадская арганізацыя "TOS Вайсрусланд" сёлета плануе адкрыць бюро кантактнай работы з наркаманамі ў Салігорску. **Старонка 2**

Ужо 1228 салігорцаў пакінулі свае подпісы за Беларушчыну

Сябры Салігорскай філіі Маладога Фронту і проста неабыякавыя да сваёй роднай мовы маладзёны працягваюць збор подпісаў за беларусізацыю грамадзкага транспарту ў горадзе. **Старонка 2**

Салігорск і Валожын — самыя добраўпарадкаваныя гарады Міншчыны

Салігорск і Валожын прызнаныя самымі добраўпарадкаванымі гарадамі Мінскай вобласці за мінулы год.Сярод пасёлкаў гарадскога тыпу першае месца заняў Івянец Валожынскага раёна. Усе адзначаныя ў конкурсе населеныя пункты разам з дыпломамі Мінскага аблвыканкама ўзнагароджаны і грашовымі прэміямі.20% атрыманых сродкаў будуць выкарыстаны на заахвочванне калектываў, што найбольш актыўна ўдзельнічалі ў рабоце па добраўпарадкаванні, 80% традыцыйна накіруюць на далейшае пераўтварэнне гарадоў, пасёлкаў і вёсак.

Адліга? НЕ, РЭПРЭСІІ!

ПРЭС-РЭЛІЗ З НАГОДЫ МАСАВЫХ ЗАТРЫМАНЬНЯЎ 14-16 ЛЮТАГА Ў САЛІГОРСКУ (Працяг, пачатак на старонке 1)

А 21-й гадзіне 14 лютага на цэнтральнай плошчы гораду, пад час чарговай спробы павесьці акцыю, былі затрыманыя браты Шылы і Андрусь Тычына (усе непаўнагадовыя). Хлопцаў даставілі ў пастарунак, дзе ў юнакоў сканфіскавалі нацыянальныя бел-чырвона-белыя сьцягі, транспаранты "МЫ ЛЮБІМ БЕЛАРУСЬ" і "ЛЮБОВІ, СВАБОДЫ, ПЕРАМЕНАЎ", а таксама сьвяточныя валянцінкі й каляндарыкі. Пасьля прыезду бацькоў хлопцаў адпусьцілі.

А 22-й гадзіне 14 лютага ў цэнтры горада намесьнік начальніка Салігорскага адзьзяленьня міліцыі Гарэлік, ён жа дэпутат Менскага абласнога Савета дэпутатаў, спрабаваў затрымаць маладафронтаўца Карнова Дзяніса. Пры гэтым ён цікавіўся ці будуць яшчэ якія-небудзі акцыі ў гэты дзень, правакаваў маладзёна, пагражаў "суткамі" і "цікавіўся" пра цяжкасьці з працаўладкаваньнем.

15 лютага адбыўся суд над моладзевым актывістам Паўлам Батуевым, затрыманым напярэдадні. Аднак з-за поўнага несупадзеньня сьведчаньняў міліцыянтаў-сьведкаў і памылак у іх пратаколах судзьдзя быў вымушаны адпусьціць Батуева і перанесьці суд на два тыдні.

16 лютага а восьмай гадзіне вечара на цэнтральнай плошчы Салігорску, ля помніка Леніну, пачалі зьбірацца прадстаўнікі дэмакратычных сілаў Салігорску і проста неабыякавыя людзі для правядзеньня традыцыйнае акцыі Салідарнасьці з семьямі зьніклых палітыкаў і палітвязьнямі. Аднак супрацоўнікамі салігорскае міліцыі сумесна з менскім спэцназам акцыя была жорстка разагнаная. Пад час разгону было затрымана 10 удзельнікаў Дня Салідарнасьці (Іван Шыла, Удадзімір Шыла, Дзяніс Карноў, Зьміцер Карноў, Дзяніс Талпека, маці Дзяніса Талпека, Анатоль Мірашнічэнка, Андрусь Тычына і іншыя). Адмыслова для затрыманьняў у Салігорск быў дастаўлены новы аўтазак, так званая "каробачка". Трэба адзначыць, што пад час затрыманьняў спэцназаўцы ўжывалі грубую фізычную сілу, то бок наўпрост зьбівалі людзей. У пастарунку на затрыманых аказваўся псыхалягічны ціск, былі незаконна ўзяты тлумачэньні і сканфіскаваныя асабістыя рэчы, кшталту каляндарыкаў і дыскаў. Цягам наступных двух гадзінаў усе затрыманыя былі выпушчаны.

З нагоды павышэньня апошнім часам перасьледу прадстаўнікоў дэмакратычнай супольнасьці Салігорску (асабліва моладзевых актывістаў і сябраў Маладога Фронту), з нагоды незаконных масавых затрыманьняў, фізычнага і псыхалягічнага ціску на Бліжэйшым часам будуць накіраваныя скаргі ў пракуратура аб незаконным затрыманьні моладзевых актывістаў 14 й 16 лютага. Будзе праводзіцца маштабовая інфармацыйная кампанія, якая прадугледжвае выданьне дзясяткаў тысячаў улётак аб палітычным перасьледзе моладзі, плянуемых акцыях у Салігорску й Беларусі. Плянуецца сур'ёзная праца па падрыхтоўцы мірных вулічных акцыяў мясцовага, рэспубліканскага й міжнароднага характару. У сувязі з масавымі затрыманьнямі пад час апошніх акцыяў, пры правядзеньні вулічных мерапрыемстваў у будучым мы будзем вымушаны запрашаць прадстаўнікоў незалежных сродкаў масавай інфармацыі як зь Беларусі, так і з-за межжа. Акрамя таго, відаць, прыйдзецца ўжываць больш радыкальныя (па беларускім меркам) сродкі ўздзеяньня на ўлады. Зь мінулае вясны ў нас была не галосная дамоўленасьць аб ня ўжываньні палітычнага графіці, аднак у сувязі з павышэньнем ціску на моладзь мы будзем вымушаны ізноў зьвярнуцца да гэтага вельмі непапулярнага сродка агітацыі й уплыву.

Што тычыцца затрыманьняў, пагрозаў, гвалту й арыштаў з боку сілавых структураў, то гэта толькі падштурхоўвае да яшчэ больш актыўнага дзеяньня й супраціву. Акрамя таго, трэба дадаць, што ў нас таксама ёсьць свая картатэка, дзе зьмешчаны ўсе асобы, адказныя і больш ці менш датычныя да цяперашніх затрыманьняў і правапарушэньняў. Безумоўна ў будучым гэтым людзям прыйдзецца адказваць за свае злачынствы і правапарушэньні ня толька перад сваімі блізкімі і грамадзкасьцю, але і перад Судом.

Дадатак: У мінулым месяцы, 20 студзеня, Салігорскі "Малады Фронт" плянаваў правесьці мерапрыемствы ў падтрымку З.Дашкевіча.

КДБ і міліцыя агульнымі намананьнямі сарвалі гэтыя акцыі, затрымаўшы 4 сябра "Маладога Фронту" і скансфіскаваўцы 3500 улётакі 6 расьцяжак.Адзін з затрыманых, Зьміцер Карноў быў пакараны 3 суткамі арышту.

Прэс-служба Салігорскае філіі Маладога Фронту

УЖО 1228 САЛІГОРЦАЎ ПАКІНУЛІ СВАЕ ПОДПІСЫ ЗА БЕЛАРУШЧЫНУ

Сябры Салігорскай філіі Маладога Фронту і проста неабыякавыя да сваёй роднай мовы маладзёны працягваюць збор подпісаў за беларусізацыю грамадзкага транспарту ў горадзе. На 7 лютага беларускамоўная моладзь Салігорску сабрала ўжо 1228 подпісаў у падтрымку беларушчыны. Адначасова з гэтым, хлопцы і дзяўчаты распавядаюць мінакам пра праблемы беларускае мовы й культуры, што існуюць у нашай краіне, цікавяцца меркаваньнем салігорцаў па гэтае праблеме.

- Людзі вельмі станоўча ставяцца да нашага звароту, шчыра і актыўна нас падтрымліваюць. Многія, нават былыя жыхары Расеі, пачынаюць размаўляць з намі па беларуску. Людзі, што ўжо пакінулі свае подпісы, прыводзяць сваіх жонак і сяброў, каб тыя таксама падтрымалі нас. - распавядае Аляксей Валабуеў, адзін з удзельнікаў кампаніі ў падтрымку беларушчыны.Як паведамілі арганізатары кампаніі, барацьба за беларушчыну ў Салігорску на гэтым ня спынецца. Маладафронтаўцы плянуюць таксама накіроўваць звароты з патрабаваньнямі пашырэньня ўжываньня беларускай мовы ў прыватныя і дзяржаўныя прадпрыемствы, фірмы і арганізацыі гораду. Акрамя таго будуць рабіцца захады, каб аналягічныя акцыі адбыліся і ў іншых рэгіёнах краіны.

Бюро кантактнай работы з наркаманамі адкрыюць у Салігорску

Міжнародная дабрачынная грамадская арганізацыя "TOS Вайсрусланд" сёлета плануе адкрыць бюро кантактнай работы з наркаманамі ў Салігорску.

Яе рэабілітацыйны цэнтр "Вылечванне і аднаўленне" ўжо восем гадоў дзейнічае ў пасёлку Астроўчыцы Светлагорскага раёну. Як паведаміў кіраўнік кантактнай работы рэабілітацыйнага цэнтра Дзмітрый Касякоў, арганізацыя ўжо ўнесла неабходныя змены ў статут, наладзіла сувязі з уладамі Салігорску.

Паводле яго слоў, за сем гадоў у рэабілітацыйным цэнтры паспяхова прайшлі курс 75 чалавек, 30% былых наркаманаў знятыя з уліку, каля 90% вылечаных становяцца членамі "TOS Вайсрусланд".

Паводле belradio.fm

Цэны на жыльлё зноў імкліва растуць

Цэны на жыльлё ў Беларусі імкліва растуць. Асабліва адчувальна гэта ў Менску, дзе квадратны мэтар аднапакаёвай кватэры каштуе каля 1400 даляраў. Паўсюль па краіне беларусы аддаюць перавагу менавіта аднапакаёўкам, што адбываецца праз падаражаньне камунальных паслугаў.

Нямецкі досьвед

Адной з прычынаў росту цэнаў на жыльлё, як на першасным, так і на другасным рынках, зьяўляецца актыўнае разьвіцьцё сыстэмы жыльлёвага крэдытаваньня. Паводле зьвестак Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, у Менску знаходзяцца на ўліку 170 тысячаў сем'яў, што маюць патрэбу ў засяленьні. Па выніках мінулага году кватэрамі былі забясьпечаныя каля 12 тысячаў сем'яў, зь якіх палову складаюць сем'і, што атрымалі жыльлё ў парадку чаргі. Калі будаўніцтва сацыяльнага жыльля будзе працягвацца такімі тэмпамі, то чарга на атрыманьне ільготнай кватэры пагражае расьцягнуцца на 30 гадоў. У міністэрстве адным са спосабаў вырашэньня праблемы бачаць выкарыстаньне вопыту Нямеччыны, дзе будаўніцтвам жыльля займаюцца камэрцыйныя прадпрыемствы. Дзяржава нават стварае гэтым фірмам ільготныя ўмовы. Таму ў Нямеччыне даўно не існуе праблемаў з жыльлём.У хуткім часе ў парлямэнт мусіць патрапіць законапраект, які прадугледжвае стварэньне сыстэмы будаўнічых ашчаджэньняў. Калі закон будзе адобраны, пэўная катэгорыя грамадзянаў зможа адкладаць грошы на адмысловым банкаўскім рахунку і потым атрымаць ільготны крэдыт на жыльлё.На сёньня цана аднаго «сацыяльнага» квадратнага мэтру ў Беларусі складае каля 400 даляраў пры сярэднім заробку 270 даляраў.

Аптымізм міністра і рэалізм незалежных назіральнікаў

Міністар архітэктуры і будаўніцтва Аляксандар Селязьнёў упэўнены, што гэта набліжае Беларусь да сусьветнага стандарту, калі на сярэдні заробак чалавек можа набыць адзін квадратны мэтар жыльля. Ён мяркуе таксама, што падаражаньне расейскага газу неістотна адаб'ецца на цэнах жыльля. Па словах міністра, дзякуючы новай цане цэмэнту, цэны ўздымуцца на 5□6%. Пры захаваньні нарматыўных умоваў кошт будаўніцтва панэльнага жыльля для жыхароў абласьцей, што маюць патрэбу ў паляпшэньні жыльлёвых умоваў, складзе 360-400 даляраў за квадратны мэтар, цагляных дамоў – 400-450 даляраў. У Менску – 450 і 520-550 даляраў, адпаведна.Сёлета ў Беларусі плянуюць пабудаваць 4 млн. 700 тыс. кв. м. жыльля, у Менску – 1 млн. 70 тыс. кв. м.

Незалежныя назіральнікі лічаць прагнозы ўраду вельмі аптымістычнымі. Паводле незалежных прагнозаў, рост цэнаў на расейскія энэрганосьбіты можа спрычыніцца да таго, што далёка ня кожны беларус здолее выкупіць толькі што пабудаванае жытло

Вымушаная папулярнасьць аднапакаёвак

Эканамічная аглядальніца газэты «Белорусы и рынок» Елізавета Булацецкая адзначае паказальную тэндэнцыю росту попыту на малагабарытнае жытло на другасным рынку. Прычынаю ёсьць павышэньне цэнаў на камунальныя паслугі. І ў першую чаргу гэта характэрна для рэгіёнаў, дзе сярэднія заробкі істотна адрозьніваюцца ад сталічных. Жыхарам райцэнтраў робіцца ўсё менш выгадна пражываць у шматпакаёўках. І калі рост цэнаў на камунальныя паслугі будзе працягвацца, попыт на малагабарытнае жыльлё ўзрасьце. Экспэрт адзначае розьніцу ў гнуткасьці цэнаў на сталічнае і правінцыйнае жыльлё: ў абодвух выпадках дынаміка росту амаль супадае, аднак цэны ў сталіцы больш чуйныя да зьменаў. Зьвяртае ўвагу на сябе і тое, што кватэры ў якой Лідзе ці Салігорску каштуюць амаль аднолькава, як і ў абласным Магілёве. Аднапакаёўку ў гэтых гарадах можна набыць ад 20 тысячаў даляраў, самая дарагая чатырохпакаёвая кватэра абыдзецца ў 42-45 тысячаў.

Украінскі фэномэн

Паводле дасьледаваньня кампаніі Global Property Guide, летась сярод 40 найбольш разьвітых і стабільных краінаў сьвету найхутчэй кошны на жытло расьлі ў Эстоніі. Тут гэты паказчык складае 54%. Але калі б у сьпіс уключылі Ўкраіну, яна, са сваімі 66%, стала б безумоўным сусьветным лідэрам. Самая танная нерамантаваная кіеўская аднапакаёўка на другасным рынку каштуе 52 тысячы даляраў. Тамтэйшыя экспэрты кажуць, што нашмат лепшае жытло ў Бэрліне ці Парыжы, каштуе, прынамсі, ня менш. Прычынай такога ёсьць імклівы рост іпатэчнага крэдытаваньня, міграцыя, рост прыбыткаў і спэкулятыўны попыт на жыльлё. Сярэдні кошт аднаго «квадрату» дасягае 2600 даляраў. Для параўнаньня – у традыцыйна дарагой Маскве гэты паказчык складае каля 4200 даляраў. У нашых заходніх суседзяў□палякаў кватэрная ліхаманка, што распачалася колькі гадоў таму, сьцішылася, і рост цэнаў летась быў ніжэйшы супраць нямецкага – 2,2%. Доўгі час не растуць цэны на жыльлё ў далёкай Японіі, а растрывожаны вайсковым становішчам Ізраіль перажывае 4%□е зьніжэньне кошту жытла.

Память будет увековечена

В 2007 году еврейская община Белоруссии планирует установить около 20 памятников на местах уничтожения евреев в годы Второй мировой войны.По словам председателя Союза еврейских общественных объединений и общин Леонида Левина, работой планированию и установке памятников и памятных знаков на месте гибели евреев занимается Комиссия по увековечению памяти евреев, погибших на территории Белоруссии в годы Второй мировой войны, которая действует при Союзе еврейских общественных объединений и общин.Именно эта комиссия и планирует в текущем году открыть в Беларуси около 20 мемориалов на местах массового уничтожения жертв нацистского геноцида.Памятники будут открыты во всех областях республики. Например, в городе Слуцке (Минская область), в Давид-Городке (Брестская область), в Мозыре (Гомельская область) и многих других.Вся работа по возведению памятников проводится силами общественности и на средства спонсоров, чаще всего иностранцев. Местные власти только дают разрешение на установку мемориала, которое, чаще всего получить непросто из-за множества различных бюрократических препон. Правда, после возведения памятника, по словам Л.Левина, местные власти чаще всего оказывают значительную помощь по благоустройству близлежащей территории и поддержанию порядка вокруг мемориала.Комиссия по увековечению памяти жертв геноцида работает при Союзе еврейских общественных объединений и общин всего три года, и за это время в республике установлено 11 памятников. Но это только малая часть той работы, которая предстоит комиссии, ведь около 150 мест массового уничтожения евреев в годы второй мировой войны на территории Белоруссии еще не увековечены.

АЕН (Михаил Мильштейн)

Кастусь Каліноўскі - легендарны паўстанец. Малады. Ідэаліст

169 год таму 2 лютага нарадзіўся вядомы дзеяч Беларусі Кастусь Каліноўскі. З гэтае нагоды прапануем вашай увазе эсэ аднаго зь лідэраў Маладога Фронту Паўла Севярынца, які зараз абывае судовае пакраньне ў вёсцы Малое Сітна на Полачыне за арганізацыю масавых вулічных акцыяў супраціву ў Менску пасьля рэфэрэндуму аб трэцім тэрміне Лукашэнкі. Эсэ "Кастусь Каліноўскі" уваходзіць у знакамітую кнігу Паўла "Нацыянальная ідэя: фэнамэналёгія Беларусі". Дарэчы ўсю кнігу ў элетронным выглядзе вы можаце знайсьці ў бібліятэцы Маладога Фронту на сайце mfront.net.

КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ

У кожнай нацыі абавязкова ёсьць такі легендарны паўстанец. Малады. Ідэаліст. Змагар супраць акупацыі, які церпіць паразу, але не скараецца – і перад сьмерцю пакідае за сабой апошняе, крылатае слова.
"Толькі тады, народзе, зажывеш шчасьліва..."
У савецкія часы Каліноўскага раскручвалі як рэвалюцыянэра – і на гэтых словах з-пад шыбеніцы цэнзура ставіла шматкроп'е.Пра Каліноўскага дарэчна сказаць: годны сын беларускага народа. У 24 гады ён узначаліў паўстаньне, ужо ў 26 загінуў.Шляхціч з Заходняе Беларусі. Студэнт Піцерскага юрфаку. Лідэр моладзі. Незалежнік. "Яська – гаспадар з-пад Вільні". Абаронца вуніі... Каліноўскі кінуў выклік усёй імпэрыі й яе генэрал-губэрнатару Мураўёву-вешальніку. Расейскаму штыку, расейскай школе й расейскай царкве.
“Бог стварыў чалавека, каб ён карыстаў з вольнасьці справядлівай” – пісаў Каліноўскі ў “Мужыцкай праўдзе”.

Каліноўскі больш года кіраваў паўстаньнем 1863-64 гг. у Беларусі й наладжваў падпольны супраціў пасьля разгрому ўзброеных традаў. Арыштаванага на кансьпірацыйнай кватэры ў Сьвятаянскіх мурох Вільні, яго прысудзілі да пятлі.
Рэдактар нелегальнае "Мужыцкае праўды" быў сапраўдны мужык. Рашучы, цьвёрды, жалезнае вытрымкі й ваярскага духу. Хлопчыкаў-"суворaўцаў" належыць пераймяноўваць якраз у "каліноўцаў".
Кастусь Каліноўскі – прозьвішча чаканае й навостранае, быццам клінок. Каліноўскі – заклік калёнае сталі. "Каліноўскі" – і колькі пакаленьняў устае з каленяў!
Каліноўскі быў чырвоны. Радыкальны колер каліны. Насуперак белым кансэрватарам, ён ставіў на рэвалюцыю: "далоў самадзяржаўе", "зямлю – сялянам", "у нас няма дваранаў – усе роўныя". Але вясковай Беларусі, пазбаўленай мовы, гісторыі й гораду, былі патрэбныя яшчэ й сьляпушчы выбух сьвядомасьці, і чыстая эліта, і сьветлае духовае адраджэньне. Беларусь чакала бел–чырвона–белага!
Кастусь Каліноўскі – галоўны герой нацыянальнага адчаю. Паўстаньне адпачатку было асуджанае на правал: самі сяляне потым лавілі й здавалі мяцежнікаў. Параза была непазьбежнай ня толькі таму, што Расейская імпэрыя валодала несувымерна большай сілай. Проста Беларусь заўжды перамагала ня гвалтам, ня зброяй, а духам і словам.

У Беларусі даражэюць паслугі мабільнай сувязі

Сёньня ў шэрагу рэгіёнаў Беларусі павялічваюцца стаўкі мясцовых падаткаў на паслугі сувязі і продаж мабільных тэлефонаў. Зьмены адбудуцца ў Менску, а таксама Гомельскай і Магілёўскай абласьцях. Стаўка падатку цяпер тут складзе 10% (раней 5-7%). Акрамя таго, падатак на продаж тэлефонных апаратаў у Менску і Менскай вобласьці падвышаецца зь 5 да 15%.Кошты на паслугі сувязі і тэлефонныя апараты павялічваюць усе без выключэньня апэратары мабільнай сувязі, якія працуюць у Беларусі. Напярэдадні пра гэта паведаміла кампанія “VELKOM”, але пракамэнтаваць абвестку ў кіраўніцтве адмовіліся. Цяпер у фірмовых крамах мяняюць таблічкі з цэнамі каля тэлефонных апаратаў. Але колькі будзе выдаткоўваць кожны новы і ранейшы карыстальнік паслугаў – не паведамляюць таксама і ў кампаніі “МТС”. Гаворыць прадстаўнік прэсавай службы Дзьмітрый Станюта.Станюта: “Мы тут прабавалі камэнтаваць такое пытаньне, як падвышэньне ставак падаткаў. Але з гэтага нічога добрага ня выйшла, бо нас сказілі і падалі інфармацыю зусім ня так, як мы гаварылі. Таму менавіта наконт гэтага – выбачайце”.Сёньня карыстальнікамі мабільных тэлефонаў у Беларусі зарэгістравана каля 6 мільёнаў абанэнтаў. Падвышэньне падатку ўдвая азначае прыкметны прыбытак у мясцовыя бюджэты і новыя выдаткі для карыстальнікаў, – гэтак пракамэнтаваў новаўводзіны старшыня Беларускага саюзу прадпрымальнікаў Аляксандр Патупа.

Патупа: “Усялякі падатак, які падае на нейкае прадпрыемства, далей пераадрасуецца на канкрэтнага кліента. Тут ёсьць эканамічны складнік, як магчымасьць збору дадатковых сродкаў падатковымі інстанцыямі.
А таксама псыхалягічны, бо лічыцца, што паслугамі мабільнай сувязі карыстаюцца людзі нябедныя, і нічога зь імі ня здарыцца. У многіх краінах кошт паслугаў мабіль-най сувязі таньнейшы за карыстаньне стацыянарнымі тэлефонамі. Ну, а ў нас ідзе працэс адваротны і дрэнны для карыстальнікаў мабільнай сувязі”.Паводле закону аб мясцовым самакіраваньні, мясцовы падатак штогод усталёўваюць абласныя Саветы дэпутатаў. Але на практыцы дэпутаты ніякага рэальнага ўплыву на такія рашэньні ня маюць, – заявіў Радыё Свабода нядаўні дэпутат бабруйскага гарсавету Алесь Чыгір. Чыгір: “Усе гэтыя рашэньні спускаюцца з выканкамаў. А паколькі дэпутаты на сёньня ў пераважнай бальшыні прайшлі па сьпісе выканкамаў, то яны будуць галасаваць “за”. Камусьці ў выканкаме ў галаву прыйшла вось такая ідэя, што можна на 5% падвысіць падатак і цягам году атрымаць вось такія даходы ў бюджэт. Рашэньне будзе прынятае і яно будзе выконвацца. Але якім будзе ягоны эканамічны эфэкт? Невялікія шапікі, якія спэцыялізуюцца на продажы мабільных тэлефонаў, магчыма, будуць вымушаныя зачыніцца. Адпаведна падаткі ў бюджэт перастануць паступаць. Людзі застануцца бяз працы, і ім давядзецца выплачваць сацыяльную дапамогу. Словам, эканамічны эфэкт ад такіх крокаў можа быць нулявы ці ўвогуле адмоўным”.

Свабодны Салігорск №5 Люты 2007 г.
незалежная газэта Салігорска
Незалежная салігорская газэта . Выдаецца з верасьня 2006 г. Кантакты:
8(029)370-02-04 8(029)379-28-99 http://gazeta.saligorsk.org salihorsk@gmail.com
Адказнасьць за змешчаны матэр’ял нясуць аўтары.
Надрукавана на асабістам абсталяваньні ІП Пятроў Г.В. наклад 299 ас.
ЗША г.Нью-Йорк вул.Драбудзькі 16-20